Журнал Белорусского государственного университета. Филология. 2019;1:72–82
Journal of the Belarusian State University. Philology. 2019;1:72–82

*УДК 821.162.3*

# ПРОБЛЕМЫ РАЗВИТИЯ ЧЕШСКОГО ИСТОРИЧЕСКОГО РОМАНА 1940–60-х гг.

***Е. В. ВОСТРИКОВА***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Освещаются проблемы развития исторического жанра в чешской литературе 1940–60-х гг. Представлена широкая панорама развития исторической прозы этого периода, называются авторы и их произведения, определяются их место и роль в литературном процессе, характеризуются идейные и жанрово-стилевые особенности. Решается проблема традиционного и новаторского в чешском историческом романе 1940–60-х гг. Выделяются основные тенденции развития в рамках каждого временного отрезка, связанного с определенными историческими и культурными событиями в Чехословакии.

***Ключевые слова:*** чешская литература 1940–60-х гг.; исторический роман; биографическая проза; ирасековская традиция; исторические аллегории; трансформация жанра; сближение исторического жанра с апокрифом; ирония; развлекательность.

# ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ ЧЭШСКАГА ГІСТАРЫЧНАГА РАМАНА 1940–60-х гг.

***А. У. ВОСТРЫКАВА***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Асвятляюцца праблемы развіцця гістарычнага жанру ў чэшскай літаратуры 1940–60-х гг. Раскрываецца шырокая панарама развіцця гістарычнай прозы гэтага перыяду, называюцца аўтары і іх творы, вызначаюцца іх месца і роля ў літаратурным працэсе, характарызуецца ідэйная і жанрава-стылявая адметнасць. Вырашаецца праблема традыцыйнага і наватарскага ў чэшскім гістарычным рамане 1940–60-х гг. Вылучаюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця ў межах кожнага часавага прамежку, звязанага з пэўнымі гістарычнымі і культурнымі падзеямі ў Чэхаславакіі.

***Ключавыя словы:*** чэшская літаратура 1940–60-х гг.; гістарычны раман; біяграфічная проза; ірасекаўская традыцыя; гістарычныя алегорыі; трансфармацыя жанру; збліжэнне гістарычнага жанру з апокрыфам; іронія; забаўляльнасць.

**Образец цитирования:**
Вострыкава АУ. Праблемы развіцця чэшскага гістарычнага рамана 1940–60-х гг. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2019;1:72–82.

**For citation:**
Vostrykava AU. The problems of development of the Czech historic novel in 1940–60s. *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2019;1:72–82. Belarusian.

**Автор:**
***Елена Владимировна Вострикова*** – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры теории литературы филологического факультета.

**Author:**
***Alena U. Vostrykava***, PhD (philology), docent; associate professor at the department of theory of literature, faculty of philology.
*vostrikova72@mail.ru*
*https://orcid.org/0000-0003-2693-981X*

# THE PROBLEMS OF DEVELOPMENT OF THE CZECH HISTORIC NOVEL IN 1940–60s

***A. U. VOSTRYKAVA*** [a]

[a] *Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article highlights the problems of the development of the historical genre in the Czech literature of the 1940–60s, gives a broad panorama of the development of the historical prose of the period, authors and their works are named, their place and role in the literary process are determined, and their ideological and genre-style features are characterized. The problem of the traditional and innovative in the Czech historical novel of this time is being solved. The main trends of development within each time interval, connected with certain historical and cultural events in Czechoslovakia, are singled out.

***Key words:*** Czech literature of the 1940–60s; historical novel; biographical prose; the Irasek tradition; historical allegories; the transformation of the genre; the rapprochement of the historical genre with the apocrypha; irony; entertainment.

Прапанаваная тэма бачыцца актуальнай для славянскага літаратуразнаўства, паколькі прайшоў якраз той прамежак часу, які дазваляе аб’ектыўна ацэньваць працэсы, што адбываліся ў чэшскай літаратуры другой паловы XX ст., расстаўляць акцэнты, вылучаць прыярытэтныя кірункі і пэўных аўтараў, якія сталі ўжо класікамі чэшскай літаратуры. Часавая перспектыва дае магчымасць рабіць высновы пра традыцыю і наватарства ў межах гістарычнага жанру. У сваім даследаванні мы абапіраліся на літаратуразнаўчыя працы чэшскіх вучоных, такіх як Ф. Кс. Шальда, Л. Махала, Д. Моцна, Ё. Грабак, Ё. Нечас, Э. Новакава, М. Сухамел, Б. Докаўпіл, Б. Гофман і інш. Пры напісанні артыкула таксама важнымі для нас былі работы расійскіх і беларускіх навукоўцаў С. Шэрлаімавай, Р. Кузняцовай, С. Нікольскага, С. Мусіенка, А. Бабракова-Цімошкіна і інш. Мэтай гэтага даследавання з’яўляецца характарыстыка і раскрыццё тых літаратурных працэсаў, якія адбываліся ў чэшскай літаратуры ў межах гістарычнага жанру ў 1940–60-х гг. на фоне грамадска-палітычных і культурных падзей тагачаснай Чэхаславакіі. Таксама ставіліся задачы вызначыць традыцыйнае і наватарскае ў чэшскай гістарычнай прозе акрэсленага перыяду, даць панарамную карціну гістарычнага рамана, вылучыць пэўныя тэндэнцыі, а таксама паказаць ідэйна-мастацкую своеасаблівасць творчасці аўтараў, якія фарміравалі тагачасны літаратурны працэс у межах гістарычнай прозы. Перыяд 1940–60-х гг. мы падзяляем на непрацяглыя этапы на падставе змен, якія адбываліся ў гістарычным, грамадскім, культурным жыцці чэхаў, і вывучаем гістарычны раман у рамках кожнага асобнага этапу, прасочваючы эвалюцыю аўтараў і іх твораў.

Гістарычны раман мае ў чэшскай літаратуры трывалыя карані і багатую традыцыю. Значнае месца гістарычнай прозы падкрэслівалася многімі чэшскімі і рускімі літаратуразнаўцамі. У гісторыі Чэхіі было шмат цяжкіх і трагічных перыядаў, а зварот да гістарычнай тэматыкі заканамерны менавіта ў такія часы. З’явіўся чэшскі гістарычны раман у 1830-я гг. Найбольшага развіцця дасягнуў у другой палове XIX ст. у творах А. Ірасека, В. Бенеша-Тршэбіскага, З. Вінтэра. У другой палове XX ст. чэшскія раманісты абапіраліся на тады ўжо класічную і хрэстаматыйную спадчыну А. Ірасека і У. Ванчуры. Той жа Ірасек, аўтар пяцітомнай эпапеі «Ф. Л. Век», тэтралогіі «У нас», трылогіі пра гусіцкія войны («Паміж плынямі», «Супраць усіх», «Братэрства»), быў амаль кананізаваны ў чэшскай літаратуры, што падкрэслівае спецыфіку статусу ў ёй гістарычнага жанру, які нёс народу погляд на чэшскую гісторыю і адыгрываў вялікую ролю ў фарміраванні нацыянальнай ідэалогіі. Пасля 1918 г., калі чэхі атрымалі дзяржаўную незалежнасць, распаўсюдзіўся «культ Ірасека» і пашырыліся яго канцэпцыя і трактоўка чэшскай гісторыі. Знакаміты чэшскі крытык Ф. Кс. Шальда нават выступіў у сваіх артыкулах супраць гэтага. Ён меркаваў, што ірасекаўская мадэль гістарычнага рамана належыць да вальтэр-скотаўскага тыпу, у якім спалучаліся рамантызм і рэалізм, што пры рэалістычнай трактоўцы падзей перашкаджае прыходу новых рыс у дадзены жанр. Пазіцыю Ф. Кс. Шальды падтрымаў пісьменнік і крытык Ю. Фучык. Рускі літаратуразнаўца А. Бабракоў-Цімошкін лічыць, што «афіцыйны “культ” Алоіса Ірасека ў Чэхаславакіі 1918–1938 гг. стаў толькі адным з фактараў, які паўплываў на развіццё чэшскага гістарычнага рамана ў XX ст.»[1] [1]. Сучасны чэшскі літаратуразнаўца Л. Махала адзначаў, што «гістарычныя творы маюць у чэшскай літаратуры багатую традыцыю, гэты факт згадае кожны, хто паспрабуе прааналізаваць мастацкія тэксты пра мінулае» [2, s. 104]. Зварот да падзей гераічнай даўніны дапамагаў чэхам усвядоміць сваю моц, сілу, абуджаў нацыянальную самасвядомасць. Расійская даследчыца С. Шэрлаімава падкрэслівала, што гістарычны жанр дамінаваў у развіцці чэшскага рамана другой

[1] Тут і далей пераклад наш. – *А. В.*

паловы XIX ст. [3, с. 5–20]. Першай спробай гістарычнага рамана ў чэшскай літаратуры стаў твор Ёзафа Лінды «Вацлаў і Баляслаў, альбо Зара над паганствам» (1818). Менавіта Ёзаф Лінда разам з Вацлавам Ганкам стаў аўтарам містыфікацыі Кралядворскага рукапісу і Зеленагорскага рукапісу, якія павінны былі сцвердзіць старажытнасць чэшскага нацыянальнага эпасу. Паэт К. Г. Маха хацеў стварыць цыкл гістарычных раманаў. Такім чынам, гістарычны жанр у чэхаў быў заўсёды запатрабаваны і фарміраваў нацыянальны міф, клікаў на барацьбу з нямецкай экспансіяй за ідэалы славянства.

Гістарычная тэматыка ў чэшскай літаратуры мае багатую традыцыю і вялікае значэнне. Аднак на чэшскіх землях не ўзнікла раманаў сусветнага маштабу, як, напрыклад, у Польшчы (раманы Г. Сенкевіча і Б. Пруса). У міжваенны перыяд гістарычны жанр не меў таго татальнага значэння, як ў XIX ст., паколькі, па словах Ф. Кс. Шальды, «усе, каго трэба было абудзіць, былі абуджаны» [4, s. 105]. Таму гістарычная проза У. Ванчуры і Я. Дурыха заставалася на перыферыі галоўных літаратурных кірункаў.

У **перыяд пратэктарату 1939–1945 гг.**, час пагрозы і ўціску, пісьменнікі, галоўным чынам аўтары вясковай прозы, хронік, зноў звярнуліся да ірасекаўскай традыцыі. Адначасова яны сталі эксперыментаваць, акцэнтуючы ў сваіх творах псіхалагічную і філасофскую лінію і развіваючы арыгінальны стыль. Так узніклі яскравыя творы К. Шульца, Ф. Кржэліны, М. В. Кратахвіла. Адыход ад рэалістычнай апісальнасці пашырыў магчымасці многіх аўтараў: Ф. Кожыка, Ф. Неўжыла, І. Маржанека. Вайна садзейнічала гарманізацыі паэтычных элементаў і дынамічнага дзеяння ў гістарычнай прозе. Узніклі як лірызаваныя раманы, так і творы з магутным эпічным складнікам.

Даследчык Д. Моцна ўказваў, што ў рабоце з гістарычным матэрыялам існуюць тры падыходы: 1) імкненне прыгожа і яскрава адлюстраваць час і псіхалогію гістарычных персанажаў; 2) паказ на гістарычным матэрыяле праблем сучаснасці; 3) зварот да гісторыі як да знешніх дэкаратыўных куліс [5, s. 240]. Над такімі падыходамі, над тым, што можа дадумаць пісьменнік, разважалі і аўтары гістарычных раманаў часоў пратэктарату. Многія пісьменнікі былі ўпэўнены ў неабходнасці знаёмства з гістарычным кантэкстам. Пра гэта пісаў Ё. Грабак, асабліва ў дачыненні да біяграфічных раманаў. Чэшскі даследчык быў упэўнены ў тым, што аўтар павінен прытрымлівацца гістарычнай праўды [6, s. 38]. Шальда таксама лічыў, што інфарматыўная функцыя ў гістарычных раманах вельмі важная, а чытач чакае не толькі эстэтычнай асалоды, але і павучання. Менавіта таму гарманічнае спалучэнне гістарычнай праўды і мастацкай вобразнасці становіцца для пісьменнікаў своеасаблівым ідэалам, да якога трэба імкнуцца. Такой канцэпцыі прытрымліваліся найперш стваральнікі біяграфічнай прозы. Пра гэта таксама пісаў літаратуразнаўца Карал Полак [7, s. 10–18]. Творы такога кшталту былі вельмі запатрабаванымі ў чытачоў перыяду пратэктарату. Пра этычныя праблемы біяграфічных раманаў разважаў Яраслаў Нечас, які лічыў, што ў якасці герояў такіх твораў павінны выступаць вельмі значныя асобы [8, s. 520–528].

Перыяд 1939–1945 гг. – час нямецкай акупацыі для чэшскага народа. Гаворка ішла пра тое, быць ці не быць нацыі, пазбаўленай самастойнасці, дзяржаўнасці і дэмакратычных свабод. Вырашалася, ці застануцца чэшская культура, мастацтва, навука. Антынямецкія настроі праяўляліся нават у авацыях пры патрыятычных сцэнах у тэатрах, байкатаванні афіцыйных культурных акцый. Улада адказала тым, што з чэрвеня 1939 г. было забаронена спяваць у кафэ і рэстаранах народныя песні. Апладзіраваць у тэатрах дазвалялася толькі ў пачатку і канцы спектакля. Маніфестацыяй «чэшскасці» стала перапахаванне астанкаў нацыянальнага паэта К. Г. Махі ў Вышаградзе, а таксама святкаванне 55-й гадавіны з дня смерці кампазітара Б. Сметаны ў маі 1939 г. Вялікае значэнне мелі таксама рэлігійныя шэсці ў гонар чэшскіх святых Яна Непамуцкага і Вавржынца ў 1939 г. У іх прынялі ўдзел больш за паўмільёна чалавек. Пасля пачатку Другой сусветнай вайны на чэшскіх землях адбыліся антынямецкія дэманстрацыі. Падчас адной з іх быў забіты чэшскі студэнт Ян Оплетал, што стала падставай для закрыцця чэшскіх вышэйшых навучальных устаноў, забойства чэшскіх студэнтаў і зняволення соцень з іх у канцэнтрацыйных лагерах. Бездань паміж чэхамі і ўладамі пратэктарату павялічвалася. Было відавочна ўжо ў 1941 г., што чэшскія і мараўскія землі не будуць лаяльнымі да Гітлера. Пасля пачатку вайны з Савецкім Саюзам пратэктарам быў пастаўлены Рыхард Гейдрых, каб навесці парадак на чэшскіх тэрыторыях. Рос уціск на чэшскае грамадства. Гейдрых ствараў атмасферу страху. З'явіліся гета для яўрэяў, пачаўся халакост. Разам з жыхарамі былі знішчаны вёскі Лідзіцэ і Лежакі. Грамадская сітуацыя пагоршылася, тэрор усё рос. Таму мастацкая і навуковая творчасць у часы пратэктарату стала найвышэйшай формай нацыянальнага жыцця. Так лічаць многія даследчыкі, напрыклад Альберт Пражак і Бендржых Вацлавек.

Галоўным становіцца падтрыманне чэшскага духу і чэшскай мовы. Аўтары «Вялікай гісторыі зямель Кароны чэшскай» Ян Гебхард і Ян Куклік назвалі чэшскую літаратуру часоў пратэктарату натхняльніцай народнага супраціву [9, s. 481]. Існавала Культурная рада, якая арганізавала «Месяц чэшскай кнігі», «Чэшскі музычны май», шэраг выстаў «Майстры – народу». На сцэне ішлі шэсць опер

Б. Сметаны. Працягвалі здымацца чэшскія кінафільмы. Літаратурнае жыццё ў пратэктараце было абмежавана цэнзурай, антысеміцкай скіраванасцю, забаронай, немагчымасцю друкавацца яўрэйскім аўтарам, турэмным зняволеннем пісьменнікаў. Але ў гэты час усё ж выходзілі новыя кнігі.

Як адзначыла Э. Новакава, «знамем літаратуры стаў гістарызм, вяртанне да мінулага» [10, s. 13]. У выдавецтвах друкавалі класіку: творы Б. Немцавай, Ё. К. Тыла, К. Светлай, Я. Неруды, Ю. Зэера, К. В. Эрбена, Ф. Палацкага. З часавым гістарызмам былі звязаны тэмы радзімы і сям'і. Проза дэманстравала зварот да эпічных апавядальных традыцый. З'явілася шмат навінак. Выключнае месца належала гістарычнаму жанру. Аўтары зноў сталі звяртацца да традыцый рэалістычнага рамана. Шырока выкарыстоўваліся псіхалагічныя і рамантычныя элементы. Выходзілі гістарычныя аповесці, раманы, хронікі, біяграфічныя творы. У першую чаргу трэба згадаць двухтомнае выданне твораў **Уладзіслава Ванчуры** «Карціны з гісторыі народа чэшскага» (1939, 1940). Кніга мела вялікі грамадскі рэзананс, набліжала новага чытача да гісторыі. Ванчура ў гэтым выданні ўвасобіў арыгінальнае мастацкае бачанне. Першы том пераважана меў характар хронікі, другі ўяўляў сабой сукупнасць аповесцей і апавяданняў. Аўтар расказваў пра чэшскую гісторыю ад найстаражытнейшых часоў. Аповед чэшскага генія пра гісторыю ў нечым абапіраўся на працы марксісцкіх гісторыкаў, што выклікала пэўныя дыскусіі і некаторыя памылкі інтэрпрэтацыі гістарычных падзей. Але ў атмасферы пратэктарату гэта было не вельмі важна.

**Іван Ольбрахт** выдаў кнігу для моладзі «Са старых летапісаў» (1940), у якой выклаў старыя міфы і легенды ў форме парафразы Чэшскай хронікі Казьмы Пражскага, Хронікі Вацлава Гаека з Лібачан і Крысцыянавай легенды. Чэшскія літаратуразнаўцы пісалі пра тое, што нацысты хацелі ў сваіх мэтах выкарыстаць вобразы Карла IV, святога Вацлава, аднак ніхто з чэшскіх пісьменнікаў не пагадзіўся стварыць падобны калабарацыяніскі раман пра гэтых асоб.

Да знакамітых прадстаўнікоў гістарычнага жанру гэтага часу належаць Ф. Кубка, Ф. Гержманек, К. Шульц, М. В. Кратахвіл і інш. Вялікую цікавасць у чытачоў выклікала «Рожмберская трылогія» (1938, 1940, 1942) І. Маржанека. Папулярнымі былі гістарычныя творы Ф. Кожыка, Ф. Кржэліны. Адной з вяршынь гістарычнага жанру стаў раман К. Шульца пра Мікеланджэла «Камень і боль» (1942). Новыя гістарычныя раманы выдавалі Я. Дурых, Ф. Шрамэк, Ё. Томан, К. Новы, Ф. Неўжыл і інш.

У **1945–1948 гг.** гістарычны раман працягваў развівацца. З чытачамі аўтары размаўлялі на мове алегорый. Як і ў часы Другой сусветнай вайны, гістарычныя алегорыі давалі аўтарам магчымасць сказаць людзям праўду пра грамадска-палітычную і гістарычную сітуацыю. Праз гістарычныя і псеўдагістарычныя гісторыі і сюжэты кнігі расказвалі пра ўяўных правадыроў і варварства войнаў. Сваёй алегарычнасцю і магчымасцямі фабульнай гульні з фактамі гістарычная проза была блізкая да ўтапічнай і фантастычнай літаратуры. Яна давала парады і рабіла спробы правільна арганізаваць сучаснае грамадскае жыццё дзякуючы сваёй іншасказальнасці.

Гэтыя рысы ўласцівыя раману **Іржы Вэйля** «Макана, бацька цудаў» (1946), напісанаму яшчэ ў 1940 г., калі аўтар не мог друкавацца і спрабаваў аддаць рукапіс у выдавецтва пад чужым імем. Гэта твор пра механізмы палітычнай хлусні і фальшывае месіянства, пра грамадскія маніпуляцыі. У рамане апісваецца канфрантацыя арабскага генерала і лжэпрарока VIII ст. з масамі. Твор супрацьпастаўляе індывідуальную волю да ўлады і імкненне бяспраўных да справядлівасці. Раман стылізаваны пад старажытную хроніку. Вэйл адыходзіць ад псіхалагізму. Асобныя эпізоды твора набываюць сваю аўтаномнасць: напрыклад, партрэты Маканавых прыхільнікаў маюць форму самастойных апавяданняў. Апавядальнік выступае як назіральнік за дзеяннем, пазбягае каментарыяў і выказвання эмоцый. Вэйл выкарыстоўвае ўсходні каларыт, вербальныя экзатызмы, на што паўплывала знаёмства пісьменніка з першакрыніцамі і адпаведным асяродкам (у 1930-я гг. Вэйл наведаў савецкую Сярэднюю Азію).

Пра прынцыпы ўлады пісаў **Іван Ольбрахт** у рамане «Захопнік» (1947). Кніга ўяўляе сабой белетрыстычную адаптацыю гісторыі захопу Мексікі амерыканскага гісторыка У. Х. Прэската. Вялікую ролю ў творы адыгрывае пазнавальная функцыя. Таксама Ольбрахт праводзіць паралель паміж Картэсам і Гітлерам, паміж супраціўленнем індзейцаў і антыфашысцкімі выступленнямі. Але ідэалагічныя рысы з цягам часу сцерліся, сталі малапазнавальнымі, у выніку адбылася пэўная рамантызацыя вобраза Картэса.

Тэма барацьбы з захопнікамі дамінуе ў гістарычных раманах **Паўла Наўмана** «Фаон» (1947) і **Уладзіміра Ванека** «Зямля крывяніць, зямля квітнее» (1946). Твор сканцэнтраваны на падзеях Трыццацігадовай вайны. Пісьменнік быў дыпламатам у Швецыі і вельмі хацеў прыцягнуць увагу грамадзян гэтай краіны да чэхаславацкіх праблем, таму ў сваёй кнізе вывеў вобразы шведаў ідэалізавана. Твор яскрава антынямецкі і агітацыйны. Аўтар актуалізуе гістарычныя падзеі. Раман «Фаон» прысвечаны эпасу пунічных войнаў, калі грэчаскія калоніі ў Паўднёвай Італіі і на Сіцыліі сталі прычынай канфлікту паміж Рымам і Карфагенам. Наўман стараецца стылізаваць свой твор пад антычнасць,

выкарыстоўвае эпісталярную форму. У творы шмат філасофскіх разваг. Пратаганіст у рамане ўсё сваё жыццё вае супраць рымскай экспансіі. Паступова ён становіцца свядомым патрыётам выключна сваёй малой радзімы і абараняе агульначалавечыя ідэалы свабоды як найвышэйшую жыццёвую каштоўнасць. Раман дэманструе алегарычнае перапляценне тэмы твора і яго актуальнага прадстаўлення.

**Мілаш Вацлаў Кратахвіл** звяртаецца да вобраза Вацлава IV у рамане «Кароль апранаецца ў лахманы» (1945). Караля аўтар паказвае самотным чалавекам, няздольным выбраць паміж супрацьлеглымі палітычнымі сіламі. Чэшскі творца разважае пра магчымасць асабістага ўдзелу ў гісторыі. У творы шмат лірызму, даецца майстарскае апісанне гарадскіх і прыродных пейзажаў. Пісьменнік выкарыстоўвае дынамічныя кантрасты, але цэнтральны герой рамана статычны. Тэму адказнасці асобы ў гісторыі ўздымае **Здэнек Урбанек** у рамане «Дарогай за Кіхотам» (1949).

Усе названыя творы 1939–1948 гг. можна назваць манаграфічнымі, паколькі яны прысвечаны адной цэнтральнай асобе. Аб'ядноўвае іх і створаная ваенная атмасфера. Герой заўсёды выступае супраць калектыву або проціпастаўляецца яму. Аўтары сваімі гістарычнымі алегорыямі імкнуцца паўплываць на тыя змены, што адбываліся ў пасляваенным грамадстве. Яны хочуць мець магчымасць маральна і сацыяльна фарміраваць грамадства.

Яшчэ адна тэндэнцыя ў гістарычнай прозе гэтага перыяду – імкненне «стварыць уяўленне пра магчымасці новага гістарычнага часу, не абцяжаранага мінулымі войнамі і памылкамі» [11, s. 215]. Такая магчымасць прыцягвала аўтараў рознай палітычнай арыентацыі: Паўла Наўмана (антыўтопія «Залаты век» (1949)), Ёзафа Копту (раман «Dies irae» (1945)), Іржы Гронека (раман «Даліна свету» (1946), у якім паказана Палестына пасля ўкрыжавання Хрыста), Ольдржыха Аўду (раман «Даліна ўзнялася» (1947)), Мілаша Гануша (раман «Легенда пра Томаша» (1947), у якім сцвярджаецца блізкасць камунізму і хрысціянства), Ёзафа Томана (раман «Славянскае лета» (1948), у якім апісваюцца мірныя працаўнікі – славяне ў процілегласць ваяўнічым германцам). Гэтыя пісьменнікі адлюстроўваюць калектыўны патрыятызм, фарміраванне новай чалавечай маралі. Аўтарская логіка падпарадкоўваецца пэўным ідэйным канцэпцыям. Утапічныя ўяўленні пра выпраўленне чалавечых парадкаў паказаны ў межах самых розных гістарычных і псеўдагістарычных тэм.

**Перыяд 1948–1955 гг.** вызначаўся новымі імпульсамі ў развіцці гістарычнага рамана. Узорам для пісьменнікаў мусіў быць А. Ірасек, які апеў гусітаў як найлепшых прадстаўнікоў чэшскага народа, а вяршыняй чэшскай гісторыі назваў гусіцкую эпоху і нацыянальнае адраджэнне. Большасць чэшскіх раманаў аўтараў у 1948–1955 гг. звярталіся да гэтых тэм, паказвалі вызваленчы, нацыянальны і рабочы рухі. Сцвярджалася, што гусіты былі першымі чэшскімі рэвалюцыянерамі. Менавіта так іх дзейнасць і трактавалася знакамітым чэшскім літаратуразнаўцам Ёзафам Грабакам у яго працы «Старадаўняя чэшская літаратура» [12, s. 113–123]. Таксама ў гістарычным рамане 1948–1955 гг. закраналася тэма сялянскіх хваляванняў пабелагорскага перыяду. Гус з рэлігійнага рэфарматара ператварыўся ў рэвалюцыянера і амаль сацыяліста. Персанажы былі «чорна-белымі», усе яны падзяляліся на станоўчых і адмоўных. Героем выступала народная маса, а не асобныя людзі, падзеі паказваліся класава дэтэрмінаванымі. Аповед быў абавязкова рэалістычным і «праўдзівым», гістарычна дэталізаваным. Псіхалагізм выкарыстоўваўся надзвычай абмежавана. Пісаліся пераважна культурна-асветніцкія і дыдактычныя раманы. Менавіта такімі былі творы В. Капліцкага «Жалезная карона» (1954), «Чацвёртае саслоўе» (1952), М. В. Кратахвіла «Магістар Ян» (1951), «Паходня» (1950), Адольфа Браналда «Хлеб і песні» (1952), Ніны Багдаравай «Танец рабоў» (1948) і інш. Ствараліся гістарычныя біяграфічныя раманы, калі гісторыя асобы разгортвалася на фоне гістарычных падзей, якія былі вельмі важнымі для ідэйнай канцэпцыі твораў. Так, можна вылучыць раман І. Маржанека пра кампазітара Б. Сметану «Песня гераічнага жыцця» (1952), Ф. Кожыка пра мастака «Ёзаф Манес» (1955) і інш. У гэтых кнігах А. Бабракоў-Цімошкін адзначае «схематызацыю сюжэта, ператварэнне герояў у адкрыта хадульных персанажаў, ідэалізацыю "мас" і шматслоўныя адступленні з тлумачэннем элементарнага сюжэта» [1]. Гістарычная проза канца 1940-х – першай паловы 1950-х гг. паступова вычарпала свае магчымасці, аўтары пачалі шукаць шляхі адыходу ад ірасекаўскай традыцыі і магчымасці свайго абнаўлення, паколькі белетрыстычнасць і забаўляльнасць зніклі, існавала запраграмаваная ідэалагічнасць, класавасць і тэндэнцыйнасць у духу готвальдаўска-сталінскіх пастулатаў.

Паступова гістарычная проза рухалася ў напрамку да псіхалагізму, пазбаўляючыся сацыялагічнасці першай паловы 1950-х гг. Назіраўся адыход ад камуністычных традыцый у сувязі з прыкметамі пэўнай адлігі ў чэшскім грамадстве. Паступова стала адбывацца трансфармацыя жанру, пераглядаліся ранейшыя традыцыі. Для пісьменнікаў арыенцірамі становяцца ідэолаг «паэтызму» У. Ванчура, каталік-мадэрніст Я. Дурых. Гістарычны сюжэт пераўтвараецца ў прастору для мастацкіх эксперыментаў, дыдактычнасць і патрыятызм, уласцівыя мінуламу перыяду, адыходзяць на другі план, выкарыстоўваюцца новыя мастацкія сродкі. Цэнтрам аповеду становіцца канкрэтная асоба са сваёй псіхалогіяй у тыя ці

іншыя гістарычныя часы. Гістарычны раман збліжаецца з псіхалагічным раманам. Праяўляецца такая рыса, як забаўляльнасць, акцэнтуюцца прыгодніцкія і любоўныя перыпетыі, як, напрыклад, у рамане М. В. Кратахвіла «Неверагодныя прыгоды Яна Карнэля» (1954).

**З другой паловы 1950-х гг.** у гістарычнай прозе назіралася тэндэнцыя да адыходу ад схематызаванай паэтыкі вялікіх палотнаў і хранікальнага аповеду пра рэвалюцыйныя падзеі і іншыя праявы грамадскага супрацьстаяння. Змяняўся погляд на гістарычны матэрыял як на дыдактычную ілюстрацыю лінейнага развіцця гісторыі да камуністычнай будучыні. З’явілася большая цікавасць да спецыфікі пэўных эпох. Хоць па-ранейшаму існавалі прымат жалезных законаў гісторыі над воляй індывідуума і неабходнасць сацыялістычнага ідэйнага гучання твораў, аднак аўтары гістарычнай прозы сталі надаваць увагу маральным і філасофскім гарызонтам персанажаў. У цэнтры часта аказваецца адзіночка, які праяўляе сябе праз псіхалагічныя апісанні, што складае процівагу яшчэ абавязковай у тыя часы сацыяльнай тыпізацыі. Але паступова адбывалася вызваленне ад эстэтычных і ідэалагічных установак сацыялістычнага рэалізму. Узмацнялася жанравая аўтаномія любімага чытачамі жанру, у які зноў пранікалі элементы эмацыянальнага і сюжэтнага напружання і забаўляльнасць: «Гістарычная проза дзякуючы факту часавай дыстанцыі ад “адназначнай” сацыялістычнай рэчаіснасці стала найлепшым полем для жанравай дыферэнцыяцыі сюжэтаў. Гэта рыса садзейнічала значным зменам і свабодзе літаратурнай камунікацыі» [13, s. 308].

Напрыклад, раман **Мілаша Вацлава Кратахвіла** «Прыгоды Яна Карнэля» спалучае рысы традыцыйнага гістарычнага жанру, як у Ірасека, з паказам народнай стыхіі ў гісторыі. Жывы і хуткі аповед стаў адной з першых прыкмет рэабілітацыі прыгодніцкай прозы, прываблiваючы маладых чытачоў. У 1956 г. пісьменнік стварае гістарычную псіхалагічную навелу «Вераніка», дзе спалучаюцца гістарычная тэма і псіхалагізм. Аповед падаецца ў форме дзённіка, лістоў. Апісваецца гісторыя маладой прыхільніцы Бажэны Немцавай. Таксама ўздымаецца праблема дзяржаўнага тэрору і сачэння за асабістым жыццём грамадзян і нагляду за культурным жыццём. **Уладзімір Вондра** пайшоў ванчураўска-ольбрахтаўскім шляхам, што заўважна ўжо ў яго дэбютным рамане «Збойніцкая балада» (1956). Твор уяўляе сабой баладычны аповед пра збойніка Ондраша. Аднак аўтар не пазбег манументальнасці і класавага дэтэрмінізму ў апісанні вобразаў. **Альфрэд Тэхнік** у рамане «Млын на падземнай рацэ» (1956) трансфармаваў таямнічасць падземных прастораў Маравіі ў таямнічасць жыцця. Аўтар спрабуе матэрыялістычна раскрыць сэнс жыцця чалавека і гісторыі. У рамане выкарыстоўваецца матыў родавага праклёну і любові, якая яго пераадольвае. Раман **Адольфа Бранальда** «Кароль чыгунак» (1959) выбарам сродкаў, матываў і людскіх тыпаў адпавядае класавым падыходам і класаваму разуменню рэчаў. Галоўны герой – буйны прускі прадпрымальнік Строўсберг. «Эфектны аповед, тэатральныя сцэны, характарыстыка персанажаў праз дыялогі, якія патрабуюць чытацкага дадумвання, акцэнт на псіхалогіі і асабістай гісторыі пратаганіста выносіць на першы план эпічную стыхію» [13, s. 310]. Аўтар імкнецца ператварыць фабулу ў метафару элітарнасці і нарцысізму, якія вырастаюць з грамадскай атмасферы другой паловы XIX ст. Прысутнічае лінія свету рабочых, але іх вобразы непераканаўчыя і неканкрэтныя. Слаба карэлююцца літаратурнасць і дыдактызм у рамане **Іржы Вейля** «Арфіст» (1958), дзе, з аднаго боку, паказана будзённасць, з другога – апісана забастоўка тыпаграфскіх рабочых у Празе 1844 г. Галоўныя героі – два яўрэі, адзін з якіх стане багатым фабрыкантам, а другі – бедным інвалідам. Уводзіцца тэма жыццёвай слабасці і аўтсайдарства.

Вырашальным імпульсам для абнаўлення ўнутранага жыцця герояў і іх адносін са знешнім светам стала развіццё ў Чэхіі **біяграфічнай гістарычнай прозы.** Тэма жыцця вялікіх асоб, асабліва творчых індывідуальнасцей, пераносіла акцэнт з сацыяльнай дэтэрмінаванасці асобы на яго складаны ўнутраны свет і рух, напружанасць, звязаныя з творчасцю і яе рэцэпцыяй. Зноў на першы план у гістарычнай прозе выходзіць матыў няпэўнасці чалавечай экзістэнцыі, ірацыянальнасці быцця і глыбокіх этычных канфліктаў, якія нясе з сабой жыццё. Аўтары звярталіся да вобразаў такіх асоб, якія фарміравалі вялікія нацыянальныя традыцыі. Выкарыстоўваюцца магчымасці псіхалагічнага даследавання чалавека. Напачатку гэта былі гістарычныя псіхалагічныя навелы, напрыклад «Сыходжу, вярнуся» (1957) Ч. Ержабека, дзе апісваецца літамышльскі эпізод, які адбыўся ў канцы жыцця Бажэны Немцавай. Аўтар адлюстроўвае біяграфічныя факты жыцця вялікай пісьменніцы, яе адзіноту, хваравітасць, адчуванне блізкасці смерці і надзею. У гэты перыяд назіралася цэлая хваля раманаў-біяграфій: выйшлі творы А. Згоржа пра Марыю Складоўскую-Кюры, Бетховена і Немцаву, Я. Лоўткавай пра Франсуа Віёна «Нягледзячы ні на што спявае паэт» (1957), Ф. Кожыка пра Сервантэса «Рыцар сумнага вобраза» (1958).

Прадметам даследавання ў трылогіі **Леанціны Машынавай** і дылогіі **Міраслава Гануша** стаў Я. А. Коменскі, прычым абодва аўтары звярталіся да асобных перыядаў жыцця вялікага пісьменніка, філосафа, педагога: Машынава – да маладосці, Гануш – да сталага ўзросту і старасці. У трылогіі Машынавай «Маладыя гады Яна Амаса» (1957), «Да лабірынта свету» (1958) і «Палаючая паходня» (1961)

Коменскі апісваецца з пачуццём, без пафасу, без глыбокіх псіхалагічных пранікненняў, затое з акцэнтам на ўплыў народа, хваробы і сямейныя трагедыі. Унутраныя супярэчнасці, вандроўкі па Еўропе і рэфлексію Коменскага паказаў М. Гануш у раманах «Лёс народа» (1957), «Вандроўнік у Амстэрдаме» (1960). У творах прадстаўлены псіхалагічны погляд на асобу Коменскага, апісваюцца яго паводзіны ў складаных этычных, філасофскіх, рэлігійных і палітычных канфліктах. У дылогіі праявілася вельмі адметная і значная для гістарычнай літаратуры 1940–60-х гг. рыса: аўтар закрануў шмат духоўных і метафізічных пластоў, паказаў гуманістычную адукаванасць і пансафісцкую скіраванасць асобы Коменскага, яго пакутлівыя пошукі Божай волі ў гістарычных перыпетыях. Лейтматывам становіцца тэма асабістай і творчай свабоды. Коменскі выступае як узор хрысціянскай дабрадзейнасці, высакародных індывідуальных і калектыўных памкненняў. Аўтар паказвае, што яго асоба фарміравалася пад уплывам багацця ўласнага эмацыянальнага жыцця. Ідэйная скіраванасць адпавядае стылістыцы твора, вучонасць Коменскага адлюстроўваецца ў доўгіх дыялогах і маналогах.

Даследчык А. Бабракоў-Цімошкін у гэты перыяд вылучае так званыя раманы дзеяння, у якіх сюжэтны складнік пераважае над гістарычным. Да такіх твораў належаць раманы Ё. Г. Тынецкага, кніга Я. Лоўткавай «Бог ці д'ябал» (1957), дылогія Ф. Кубкі пра рыцара Ячмінека (1957–1958), кніга Я. Махоня пра гусіцкія войны «Выгнаннікі» (1957). Па-ранейшаму некаторыя творцы працягвалі традыцыю ірасекаўскага гістарычнага рэалістычнага рамна: В. Капліцкі («Сціснуты кулак» (1959), «Табарская рэспубліка» (1969)), К. Ё. Бенеш («Семя цмока» (1957), «Наступленне» (1965)).

Былі створаны шэраг значных твораў, напрыклад пенталогія **Уладзіміра Нэфа** пра ўзвышэнне і заняпад дзвюх пражскіх буржуазных сямей другой паловы XIX – першай паловы XX ст. Крытыка назвала твор сапраўдным рэалістычным эпічным раманам. У пенталогіі аўтар не толькі працягваў традыцыі У. Ванчуры, але і звяртаўся да набыткаў стваральніка чэшскага гістарычнага рамана А. Ірасека, які таксама стварыў пяцітомную эпапею «Ф. Л. Век». Нэф, як і яго папярэднікі, раскрыў панараму развіцця чэшскага грамадства за сто гадоў, паказаў розныя слаі насельніцтва: буржуазію, студэнцтва, інтэлігенцыю, рабочых. Абапіраючыся на гісторыю свайго роду і шэраг гістарычных дакументаў, чэшскі пісьменнік не пазбег уплыву ідэалогіі 1950-х гг., акцэнтаваўшы ўвагу менавіта на рабочым і рэвалюцыйным руху. Аднак рускія даследчыкі як пэўны недахоп адзначаюць, што Нэф абмінуў у сваім вялікім творы постаць Т. Г. Масарыка, ключавую для палітыкі і гісторыі свайго часу (гл. [14, с. 241]). У акрэслены перыяд былі напісаны першыя дзве кнігі пенталогіі «Шлюбы па разліку» (1957) і «Імператарскія фіялкі» (1958). Аўтар наблізіўся да формы сямейнай сагі, наследуючы традыцыі Т. Мана («Будэнброкі») і Д. Галсуорсі («Сага пра Фарсайтаў»). Аўтар спалучае панарамны погляд на гісторыю і пільную ўвагу да вобразаў герояў. Галоўная думка Нэфа заключаецца ў тым, што міжасабовыя зносіны ў буржуазных сем'ях будуюцца на сіле грошай, і таму такія сем'і не могуць быць шчаслівымі. Усюдыісны апавядальнік пераходзіць ад іроніі да разумення і спачування, толькі калі звяртаецца да жаночых вобразаў. Пенталогія Нэфа скіравала чэшскую гістарычную прозу да апісання асобнага чалавека.

Калі на мяжы 1950–60-х гг. назіраўся публікацыйны бум гістарычнай прозы, які суправаджаўся зменай літаратурных арыенціраў, то ў **1960-я гг.** гістарычных твораў выходзіла значна менш. Разам з тым гэта быў якасна новы перыяд, калі гістарычнай прозы друкавалася няшмат, але ўзнікалі асобныя творы, якія выразна ўпісваліся ў літаратурны кантэкст і спрыялі далейшым зменам жанру. Асабліва гэтыя тэндэнцыі сталі адчувальнымі з другой паловы 1960-х гг. Важным знакам новай формы твораў было іншае разуменне адносін паміж індывідуумам і гісторыяй. Калі раней гістарычная проза арыентавалася на класавую прадвызначанасць вобразаў і развіццё жанру (напрыклад, у 1956–1963 гг. многія творы ўзнікалі ў палеміцы з папярэднім перыядам і ўказвалі на розніцу паміж грамадскай дэтэрмінаванасцю чалавека і яго асабістым, складаным чалавечым лёсам), то ў другой палове 1960-х гг. гэты палемічны аспект знікае. У ключавых гістарычных раманах такіх майстроў, як О. Данек, К. Міхал, У. Кёрнер, І. Шотала паўстае чалавек як такі, без класавых атрыбутаў, а яго гісторыя распавядае пра ўсеагульныя чалавечыя пошукі, памылкі, пытанні. Хоць грамадскія акалічнасці па-ранейшаму фарміруюць абрысы сюжэта і надаюць расказанаму канкрэтную гістарычную афарбоўку, тое, што прыносіць пратаганісту пакуты, – гэта звычайны чалавечы досвед, атрыманы ў выніку сутыкнення з гісторыяй, з яе парадаксальным і сляпым бегам, незалежным ад асабістых чалавечых пажаданняў.

Адметнасцю гістарычнай прозы гэтага часу быў глыбокі скепсіс адносна гісторыі, які вырастаў з расчаравання рэальнымі вынікамі камуністычнага перавароту, з сумненняў у высокіх якасцях правадыроў рэвалюцыі і няўпэўненасці ва ўсемагутнасці людской волі. Скепсіс спарадзіў падазрэнні ў тым, што гісторыя мусіць быць каварнай, што яна абарочваецца супраць тых, хто яе нібыта стварае, супраць ілюзій пра сілу чалавечага розуму і дзейснасць літаратуры. Таму сюжэты гістарычных твораў акрэсленага перыяду часта апісваюць хаджэнні героя па коле: у канцы ён аказваецца ў той жа сітуацыі, што і на пачатку, толькі цяпер у яго няма ілюзій.

Важнай рысай большасці гістарычных твораў становіцца іронія (у папярэдні перыяд да яе звяртаўся толькі Уладзімір Нэф): апавядальнік амаль заўжды добра разумее разыходжанні паміж гістарычнай рэальнасцю і сваімі наратыўнымі канструкцыямі. Празаікі болей не жадалі адлюстроўваць «гістарычную праўду», яны ўсвядомілі рэлятывізм многіх рэчаў, гістарычных падзей і іх аўтарскай інтэрпрэтацыі. Як і ў прозе на сучасную тэматыку, у асобных гістарычных творах шырока пачалі выкарыстоўвацца я-форма і суб'ектыўная перспектыва, фрагментарнасць аповеду, пры якой спалучалася бачанне розных персанажаў і самога наратара. Мэта гістарычнай прозы заключалася ў тым, каб паказаць складанасць чалавечага існавання ў плыні гісторыі, прычым акцэнт рабіўся ўжо на асабістым чалавечым вопыце, што дало магчымасць праводзіць паралелі паміж гістарычным мінулым і сучаснасцю.

У процілегласць аўтарам папярэдняга перыяду празаікі другой паловы 1960-х гг. ужо не стараліся даць чытачам узор для паводзін і не разважалі пра тое, што правільна, а што памылкова, што чытач павінен асуджаць, пра што шкадаваць. Яны проста распавядалі пра людскія лёсы. Іх героі, як правіла, часта заходзілі ў тупік асабістага і грамадскага расчаравання. Творы больш не мелі характару адказаў, хутчэй, яны станавіліся адкрытымі пытаннямі і прымушалі пра нешта задумвацца самім і дадумваць апісанае.

Паколькі смерць Сталіна паспрыяла перагляду сацыялістычнага руху ХХ ст., гэта адбілася і на літаратуры тэндэнцыямі да дэмакратызацыі і большай разняволенасці. У чэшскім гістарычным рамане 1960-х гг. пачалі ўздымацца праблемы маралі, ідэалогіі, самавольства ўлады. Пісьменнікі сталі абмяркоўваць тэмы ўлады і барацьбы за свае погляды, праблемы пераследаванняў за ўласнае светабачанне. Чэшскія пісьменнікі адыходзілі ад тэмы сялянскіх паўстанняў і рабочага руху і звярталіся да праблем інтэлігенцыі і тыраніі, канфлікту ўлады і сумлення, пісалі пра дыктатараў, злоўжыванне ўладай, супраціўленне, якое інтэлектуалы аказвалі ціску таталітарызму. Пра гэта сведчаць гістарычныя раманы А. Дворжака «Магістр Іеранім» (1961), В. Капліцкага «Молат ведзьмаў» (1963). Тыранію часоў Тыберыя і Калігулы апісаў Ё. Томан у сваім рамане «Пасля нас хоць патоп» (1963).

Адным з першых твораў, які прадэманстраваў адыход ад ранейшай эстэтыкі і яе змену, стаў раман **Мілаша Швахі** «Драпежнік» (1966), тэматычна блізкі да твора А. Бранальда «Кароль чыгунак». Раман расказвае пра будаўніцтва так званай Паўночнай дарогі з Вены на Паўночную Маравію да Галіцыі. Пластычна, але, як мяркуюць даследчыкі, без асаблівага эстэтычнага ўнёску, аўтар паказаў свет і інтрыгі буйных банкіраў, асяродак тэхнічных служачых і дарожных інжынераў. У творы згадваюцца сацыяльныя хваляванні на чыгунцы ў 1844 г. У духу гістарычнай ілюстрацыі напісаны раман **Франка Тэтаўэра** «Працэсія з паходнямі» (1968), дзе паказваецца зараджэнне сокальскага руху ў чэшскім грамадстве 1860-х гг. Раман вызначаецца нетыповым для свайго часу патрыятычным пафасам. У ім апісаны кансерватыўныя пражскія мяшчане і германізаваныя чыноўнікі. Трохтомны твор **Вацлава Капліцкага** «Табарская рэспубліка» (1969) адлюстроўвае хроніку першых 30 гадоў гусіцкага Табара, фарміраванне думкі пра сацыяльную справядлівасць. Самая вялікая ўвага надаецца Яну Жыжку і Пракопу Голаму, слынным гусіцкім дзеячам. Але ў творы дзейнічаюць дзясяткі персанажаў, паказаных не як асобы, а як сама гісторыя. У сувязі з гэтым многія чэшскія даследчыкі называюць раман ілюстрацыйным і ўказваюць на нераспрацаванасць многіх імпульсаў і ліній, якія маглі б спрыяць адраджэнню і ўзнаўленню гістарычнай прозы [15, s. 375]. Маляўнічае апісанне дзеяння і гісторыі знойдзем у раманах **Францішка Неўжыла** пра чэшскіх каралёў і каралеў Высокага сярэднявечча «Каралева Элішка Рэйчка» (1968), «Каралеўскі сон» (1970).

«Антыірасекаўскім», паводле вызначэння крытыка М. Сухамела [16, s. 4], і наватарскім стаў раман **Карэла Міхала** «Гонар і слава» (1966). У ім апісваецца гісторыя чэшскага рыцара Вацлава Рынды ў апошнія дні Трыццацігадовай вайны. Галоўным героем становіцца асоба негераічная. Аўтар ідзе супраць тэндэнцыі, якая панавала раней, калі чалавек выступаў стваральнікам гісторыі і барацьбітом за чалавечы прагрэс. Усе астатнія персанажы – каталікі, пратэстанты і чэшскія патрыёты-эмігранты – кіруюцца асабістай выгадай, а не шчасцем нацыі. Міхал апавядае пра тое, што знікаюць асноўныя жыццёвыя каштоўнасці, вера і праўда, гонар і слава. Усё становіцца адносным у гэтым жыцці. Лексіка рамана зніжаная, ужываецца шмат вульгарызмаў, адсутнічаюць пафасныя і патэтычныя сцэны, так уласцівыя прозе А. Ірасека. «Філасофія чэшскай гісторыі, такая простая і зразумелая ў межах традыцыі, абрастае ў Міхала мноствам пытанняў» [1]. Улады аб'явілі Міхала нядобранадзейным, таму што вастрыё яго прозы было звернута перш за ўсё супраць нацыянальных міфаў: супраць міфа пра чэшскую гісторыю, поўную гераізму і славы, супраць гераізацыі чэшскіх рыцараў, ідэі пра тое, што народ верны сваім правадырам, а апошнія заўжды шляхетныя і годныя, супраць упэўненасці ў здаровым розуме чэшскага фальклорнага героя Гонзы, незнішчальнасці духоўных чэшскіх традыцый. Вядучы прынцып у творы – сатырычны парадокс. Апавядальнік не шкадуе іроніі ў дачыненні да галоўнага героя Рынды. Гісторыя падмяняецца фарсам. Вялікія дзеянні і ўчынкі паказаны ў карыкатурным выглядзе, а вернасці

і адданасці надаецца адценне глупства. Такім чынам, у гістарычную прозу ўваходзяць элементы сюжэтнай гульні, якія адкрылі магчымасць паралельнага, цалкам іншага погляду на гісторыю. Гэта збліжае гістарычны жанр з апокрыфам, які шырока ўжываўся ў творчай дзейнасці яшчэ К. Чапекам і дэманстраваў іншыя падыходы да знаёмага матэрыялу.

У чэшскай літаратуры 1960-х гг. **збліжэнне гістарычнага жанру з апокрыфам** становіцца яскравай тэндэнцыяй, што праявілася ў многіх тагачасных пісьменнікаў. Падобны падыход прадэманстраваў **Мілан Угдэ** ў зборніку «Таямнічая вежа ў В.» (1967), дзе змешчаны сатырычныя гістарычныя творы. Угдэ апелюе да чапекаўскай традыцыі літаратурных апокрыфаў з рацыяналістычнай дэміфалагізацыяй і іранічным падыходам да тэмы. Аўтар піша пра маніпуляцыі ўлады з праўдай, зыходзячы з актуальных палітычных праблем. Угдэ выкарыстоўвае такія мастацкія прыёмы, як рамачныя канструкцыі, фрагментарнасць аповеду, моўная стылізацыя. Тэму чалавечых слабасцей распрацоўваў **Францішак Непіл** у зборніку «Дзе блукаў, сатана?» (1966). На гістарычных або псеўдагістарычных прыкладах пісьменнік дэманструе нязменнасць чалавечых характараў, асабліва адмоўных рыс. Да чапекаўскай апакрыфічнай традыцыі звяртаўся і **Ілья Гурнік** у творах «Трубачы з Іерыхона» (1968), «Капіталійскія гусі» (1969). Казачны матыў абуджэння скульптуры ўжыты ў сюжэце гістарычнай навелы **Багуслава Бржэзоўскага** «Іахім, ці Прагнасць улады» (1967), у якой аўтар гаворыць пра злоўжыванне ўладай, культ асобы. Характар апокрыфа мае і вялікі раман **Івана Кржыжа** «Праўда пра пагібель Садома» (1968). Твор стылізаваны пад запісы відавочцы знішчэння біблейскага горада, чалавека, які быў адным з нямногіх, хто зразумеў, чаму ўвогуле дайшло да знікнення горада. Кржыж піша пра рэвалюцыі, якія губяць самі сябе, пра законы дэгенерацыі палітычнай улады, якая заснавана на хлусні і падаўленні чалавечай свабоды. Садом становіцца мадэллю, алегарычным вобразам чэшскага грамадства 1950-х гг., у якім панавала адна палітычная партыя, якая выкарыстоўвала вобраз ворага і выдумкі пра знешнюю пагрозу, каб маніпуляваць людзьмі. Хлусня зрабілася інструментам палітычнай барацьбы і перарасла саму сябе, выклікала страшныя наступствы, вынікам якіх стала ўзрастанне рэпрэсій і распад грамадства. Іранічная інтэрпрэтацыя міфалагічных і біблейскіх тэм даецца ў зборніку «Антыпакуты Гасподня» (1966) **Карэла Эйхлера**, які ўжыў жанр апокрыфа з элементамі літаратурнага і моўнага эксперыменту. У зборніку выразна адчуваецца моцная кафкіянская традыцыя.

Аўтарамі, якія ў другой палове 1960-х гг. кардынальна змянілі вобраз чэшскай гістарычнай прозы і распрацавалі падыходы, якія вызначылі яе развіццё ў наступныя тры дзесяцігоддзі, былі О. Данек, І. Шотала і У. Кёрнер.

Першы раман драматурга **Ольдржыха Данека** «Кароль уцякае з поля бою» (1967) належыць да тых твораў, якія арыентаваліся на чапекаўскую традыцыю апакрыфічнай прозы, дэміфалагізавалі гісторыю, былі прасякнуты іроніяй і гістарычным скепсісам і самім спосабам вядзення дыялогу пра грамадскія і філасофскія пытанні, перш за ўсё пытанні сумяшчальнасці ідэалу і палітычнай сілы, улады, былі наватарскімі. Дагэтуль Данека ўжо добра ведалі як драматурга і сцэнарыста, таму ў гістарычную прозу ён прынёс майстэрства кароткіх дыялагізаваных падыходаў да матэрыялу, якія дакладна датавалі і лакалізавалі дзеянне. Моўная стылізацыя была выразна сучаснай. Вобразы ў Данека выступалі носьбітамі пэўных поглядаў і настрояў, якія прысутнічалі ва ўсім тэксце і перарасталі ў актуальныя балючыя пытанні. Арыентацыя аўтара на палітычныя і любоўныя інтрыгі ў вышэйшых колах каралеўства нібы вяртае чытача ў яшчэ даірасекаўскія часы, калі ў рамантычнай гістарычнай прозе ўлюбёнымі героямі былі Ян Люксембургскі, Элішка Пршэмыслоўна і інш. Але пісьменнік не задавольваецца выключна эратычнымі жарсцямі і палацавымі інтрыгамі, а намагаецца, каб яго героі былі паўнакроўнымі вобразамі і носьбітамі філасофскай і маральнай пазіцыі. Цэнтральная філасофская тэма названага рамана звязана з постаццю караля Яна, які ўступіў на трон будучы ўпэўненым у сваёй веры ў справядлівасць і ў тым, што ён варты сваёй місіі. Аднак бясконцыя спрэчкі са шляхтай, мяшчанамі і, урэшце, са сваёй жонкай пераконваюць героя ў тым, што ўладу нельга спалучыць з ідэалам, а праўда можа быць смяротна небяспечнай і ўладар павінен умець супрацоўнічаць з ворагамі і здраднікамі. Кожны з герояў рамана адчувае іронію гісторыі. Падзеі ранняй люксембургскай эпохі з'яўляюцца ў Данека асновай для паказу ідэй і маральнай пазіцыі. Персанажы абмаляваны як сучаснікі, якія гавораць і думаюць так, нібы прайшлі праз гістарычныя выпрабаванні XX ст. Даследчыкі разважаюць пра аўтарскі этычны рэлятывізм, які ўвасобіўся ў вобразе Індржыха з Ліпэ, палітычнага гульца і скептычнага назіральніка маральных расчараванняў караля Яна [15, s. 379]. Тым не менш у інтэрпрэтацыі гісторыі на першы план выступае сталае імкненне да ідэалу. Сама гісторыя трактуецца Данекам як ланцуг спроб па «задавальненні маральнай смагі», тугі па лепшым свеце – спроб марных, але прыгожых.

У канцы 1960-х гг. у гістарычным жанры выступіў паэт і празаік **Іржы Шотала**, які ў сваім рамане «Таварыства Ісусава» (1969) звярнуўся да складаных часоў контррэфармацыі. Гэты раман – другі вяршынны твор 1960-х гг. у чэшскай гістарычнай прозе. Аўтар стаў творцам новага тыпу, яго гістарычная проза была незалежнай ад папярэдняй традыцыі. Сваю ролю ў гэтым адыграла паэтычная

дасведчанасць І. Шоталы, якая праявілася ў кожным слове і сказе тэксту. Пісьменнік перанёс цяжар увагі з гістарычных падзей на ўнутраную псіхалогію асобы, аўтарскі каментарый, апісанне дзеяння становяцца другаснымі. На першы план выходзяць суб'ектыўныя пласты, самі персанажы, іх гісторыя і жыццёвыя перыпетыі. Раман дэманструе шмат тапаграфічных, культурна-гістарычных дэталей, цесна злучаных з рэгіянальнай гісторыяй усходняй Чэхіі. Тэматыка пабелагорскай рэкаталізацыі ў рамане змяняецца на ўнутраныя спрэчкі і канфлікты двух галоўных герояў: езуіта, які мае заданне ўмацаваць пазіцыі каталіцкай царквы ў Кашумберкскім маёнтку, і графіні, якая спачатку супрацiўляецца рэкаталізацыйнаму ўціску, а потым падпарадкоўваецца. Узаемадачыненні патэра Гада і графіні паказаны не толькі як адносіны людзей рознага грамадскага статусу і розных ідэалаў, але як сувязь дзвюх асоб, якіх збліжае ўзаемная залежнасць, як залежнасць ахвяры і ката, які таксама з'яўляецца ахвярай. Напружанне паміж грамадска-гістарычнымі пластамі рамана і псіхалагічнай плынню твора дае аўтару магчымасць шматбаковай актуалізацыі падзей і думак. Ключавая праблема рамана – пытанне магчымасці спалучыць ідэал з уладай, раздваенне чалавечай душы, якая вагаецца паміж абавязкам і сваімі жаданнямі, падпарадкаваннем і асабістай свабодай. Езуіцкі ордэн выступае ў рамане як адзін з многіх прыкладаў таго, што воля да ўлады, яе прага перамагае першапачатковыя ідэалы любові і справядлівасці. Паказваецца гісторыя паступовага змірэння патэра Гада з тым, што бой за веру пад сцягамі любові і надзеі змяняецца стратай ілюзій.

Гісторыя, як паказвае Шотала, нібы воз, і ў чалавека ёсць толькі дзве магчымасці: або ты ўскочыш у яго, або ён цябе раструшчыць пад коламі. Усюдыісным і ўсюдыпранікальным становіцца ў рамане адчуванне марнасці чалавечых намаганняў. Бег часу спрыяе старэнню і ўзнікненню пачуцця стомленасці і расчаравання. Філасофскія аспекты тэксту рэалізуюцца перш за ўсё ў дыялагічных частках твора, якія сведчаць пра драматургічны патэнцыял аўтара. Гэта разважанні пра свядомасць адной асобы і цэлага народа, пра перакананні, прынцыповасць і прыстасавальніцтва. Шотала, як і Данек, піша не столькі пра ідэал, колькі пра магчымасці яго дасягнення. Раман успрымаецца як пратэст супраць чалавечых страт і расчараванняў, як абарона асабістага ідэалізму насуперак таму, што многія індывідуумы прайграюць свой бой са светам. Шотала выкарыстаў такія сучасныя для прозы прыёмы, як унутраны маналог, спалучэнне аўтарскага аповеду і аповеду ад асобы героя. Праблематыка рамана выклікала пэўныя паралелі з сучаснасцю пісьменніка. Менавіта гэты раман Шоталы стаў наватарскім у тагачаснай гістарычнай прозе Чэхаславакіі, паколькі пасадзейнічаў звароту пісьменнікаў да новых мастацкіх прыёмаў у творах адпаведнай праблематыкі.

У літаратурным працэсе тых гадоў яшчэ адным сапраўдным наватарам быў **Уладзімір Кёрнер**, які праславіўся гістарычнымі раманамі «Сляпы рукаў» (1965) і «Адэльгейд» (1967), прысвечанымі маральным праблемам, якія сталі актуальнымі ў першыя месяцы пасля заканчэння Першай сусветнай вайны. У 1970 г. выйшаў раман Кёрнера «Пясчаная каса». Паколькі аўтар быў сцэнарыстам, яго мастацкі метад выразна візуальны. Карціны ў творы вельмі яскравыя. Сам пісьменнік неаднойчы падкрэсліваў, што не хоча пісаць класічную гістарычную белетрыстыку, заснаваную на датах і гістарычных падзеях. Яго стаўленне да гістарычных крыніц вольнае. Перад чытачом паўстае пейзаж душы, а не пэўнай аўтэнтычнай геаграфічнай прасторы. Гісторыя лакалізавана ў XIII ст. Важную ролю адыгрывае ордэн нямецкіх рыцараў. Лёс галоўнага героя Альвіна ўяўляе сабой пазачасавыя пошукі сэнсу жыцця, вечнай тугі па абсалюце. Сувязь чалавека і гісторыі Кёрнер бачыць як адносіны трагічнага расчаравання. Чалавечае жыццё ў яго нагадвае блуканне па коле, у выніку чаго герой вяртаецца на сваё першапачатковае месца. Смерць выступае як пачатак і канец яго жыццёвай гісторыі. Такім чынам, раман дэманструе зварот да экзістэнцыяльнай праблематыкі.

Тры вылучаныя раманы Данека, Шоталы і Кёрнера прадэманстравалі вялікія поспехі чэшскай гістарычнай прозы другой паловы 1960-х гг. З імі будзе звязаны цэлы шэраг твораў 1970–90-х гг., якія прама або ўскосна арыентаваліся на гэтыя ўзоры. Гаворка пра творы В. Эрбена, У. Нэфа, У. Мацуры і многіх іншых.

Такім чынам, заўважная эвалюцыя чэшскай гістарычнай прозы 1940–60-х гг. звязана са зменамі грамадска-палітычных рэалій і культурнай атмасферы ў Чэхаславакіі. Гістарычны раман паступова адыходзіў ад ірасекаўскай мадэлі гістарычнай прозы, ад дыдактычнай, патрыятычнай і сацыяльнай дэтэрмінаванасці, ад героя-барацьбіта і паказу значных грамадскіх рухаў. Схематызм пабудовы гістарычных твораў замяняўся большай разняволенасцю ў дачыненні да тэм, герояў, спосабаў нарацыі. Змянялася сама канцэпцыя гісторыі, калі чалавек са стваральніка гісторыі і барацьбіта за лепшую будучыню пераўтвараўся ў пясчынку гістарычнага кругаабароту, поўную няпэўнасці, расчаравання і адчаю. Павялічылася ступень псіхалагізацыі гістарычных твораў. Усё гэта вяло да з'яўлення ў другой палове 1960-х гг. сапраўды наватарскіх раманаў, якія сваёй экзістэнцыяльнай праблематыкай і новымі спосабамі падачы матэрыялу фарміравалі новыя падыходы ў гістарычным жанры.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Бобраков-Тимошкин А. Бегство от «памяти жанра»: стратегия идеологизации и деидеологизации в чешской исторической прозе. *НЛО* [Интернет]. 2005;71 [процитировано 28 мая 2018 г.]. Доступно по: http: magazines.russ.ru/nlo/2005/71bob-17-pr.html.

2. Machala L. *Literární bludiště*. Praha: Brana; 2001. 256 s.

3. Шерлаимова СА. Владимир Нефф и его трилогия о Петре Кукане. В: Нефф В. *У королев не бывает ног*. Аксель Т, Мартемьянова В, переводчики. Москва: Художественная литература; 1990. с. 5–20.

4. Šalda FK. Nejnovějši proza česká. V: Šalda FK. *Kritické glosy k nove poezie české. Svazek 13.* Praha: Melantrich; 1939. 539 s.

5. Mocná D. Historicky roman. V: Mocná D, Peterka J a kolektiv. *Encyklopedie literárních žanrů.* Praha: Litomyšl; 2004. 704 s. 699 s.

6. Hrabak J, Kožik F. *Portrety spisovatelů*. Praha: Československý spisovatel; 1984. 285 s.

7. Polák K. O životopisnem romaně. *Svazky uvah a studie.* 1941;62:10–18.

8. Nečas J. Nad životopisnem romanem. *Naše doba.* 1941;48:520–528.

9. Gebhart J, Kuklik J. *Velké dějíny zemí Koruny České. Svazek 15. 1938–1945.* Praha: Paseka; 2007. 745 s.

10. Nováková E. *Česky Historicky roman v období protektoratu.* Brno: Cerm; 2012. 404 s.

11. Janoušek P a kolektiv. *Dějiny české literatury 1945–1989. Svazek 1. 1945–1948.* Praha: Academia; 2007. 431 s.

12. Hrabák J. *Starší česká literatura.* Praha: Statń pedagogické nakladatelstvi; 1979. 111 s.

13. Janoušek P a kolektiv. *Dějiny české literatury 1945–1989. Svazek 2. 1948–1958.* Praha: Academia; 2007. 549 s.

14. Литература Чехословакии. В: Шерлаимова СА, Хорев ВА, Ильина ГЯ, редакторы. *История литератур Восточной Европы после II мировой войны. Том 1. 1945–1960 гг.* Москва: Индрик; 1995. 696 с.

15. Janoušek P a kolektiv. *Dějiny české literatury. Svazek 3. 1958–1969.* Praha: Academia; 2008. 688 s.

16. Suchomel M. Anti-Irasek. *Literární noviny.* 1967;16:4.

## References

1. Bobrakov-Timoshkin A. [The escape from the «memory of the genre»: the strategy of ideologization and de-ideologization in Czech historical prose]. *NLO* [Internet]. 2005;71 [cited 2018 May 28]. Available from: http:magazines.russ.ru/nlo/2005/71bob-17-pr.html. Russian.

2. Machala L. *Literární bludiště* [Literary maze]. Praha: Brana; 2001. 256 p. Czech.

3. Sherlaymova SA. [Vladimir Neff and his trilogy about Peter Koukane]. In: Neff V. *U korolev ne byvaet nog* [The queens do not have legs]. Aksel T, Martemyanova V, translators. Moscow: Khudozhestvennaya literatura; 1990. p. 5–20. Russian.

4. Šalda FK. [The latest Czech prose]. In: Šalda FK. *Kritické glosy k nove poezie české. Svazek 13.* [Critical glosses for new Czech poetry. Volume 13]. Prague: Melantrich; 1939. 539 p. Czech.

5. Mocná D. [Historically Roman]. In: Mocná D, Peterka J a kolektiv. *Encyklopedie literárních žanrů* [Encyclopedia of literary genres]. Praha: Litomyšl; 2004. 699 p. Czech.

6. Hrabak J, Kožik F. *Portrety spisovatelů* [Writer portraits]. Prague: Československý spisovatel; 1984. 285 p. Czech.

7. Polák K. [About Biography novel]. *Svazky uvah a studie*. 1941;62:10–18. Czech.

8. Nečas J. [Above the biography novel]. *Naše doba.* 1941;48:520–528. Czech.

9. Gebhart J, Kuklik J. *Velké dějíny zemí Koruny České. Svazek 15. 1938–1945* [The great happenings of the Czech Crown. Volume 15. 1938–1945]. Praha: Paseka; 2007. 745 p. Czech.

10. Nováková E. *Česky Historicky roman v období protektoratu* [Česky historically roman during the protectorate]. Brno: Cerm; 2012. 404 p. Czech.

11. Janoušek P a kolektiv. *Dějiny české literatury 1945–1989. Svazek 1. 1945–1948* [History of Czech Literature. Volume 1. 1945–1948]. Praha: Academia; 2007. 431 p. Czech.

12. Hrabák J. *Starší česká literatura* [Older Czech literature]. Praha: Statń pedagogické nakladatelstvi; 1979. 111 p. Czech.

13. Janoušek P a kolektiv. *Dějiny české literatury 1945–1989. Svazek 2. 1948–1958* [History of Czech literature. Volume 2. 1948–1958]. Praha: Academia; 2007. 549 p. Czech.

14. [Literature of Czechoslovakia]. In: Sherlaimova SA, Khorev VA, Il'ina GY, editors. *Istoriya literatur Vostochnoi Evropy posle II mirovoi voiny. Tom 1. 1945–1960 gg.* [History of Eastern European literature after World War II. Volume 1. 1945–1960]. Moscow: Indrik; 1995. 696 p. Russian.

15. Janoušek P a kolektiv. *Dějiny české literatury 1945–1989. Svazek 3. 1958–1969* [History of Czech literature. Volume 3. 1958–1969]. Praha: Academia; 2008. 688 p. Czech.

16. Suchomel M. [Anti-Irasek]. *Literární noviny.* 1967;16:4. Czech.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 07.09.2018.*
*Received by editorial board 07.09.2018.*